ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.24 (3286) ● ЧАЦВЕР, 28 ЧЭРВЕНЯ, 2012

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

“Голас Радзімы” — на пачэсным месцы
На гарадскім свяце ў Новасібірску прэзентаваліся беларускія выданні Стар. 2

...І роспіс золатам па шкле
У Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрылася выстава твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Каштоўныя ўзоры” з Гістарычнага музея Расіі Стар. 3

Старажытныя глечыкі на сучасны лад
Юныя ганчары ў Століне адраджаюць даўнія традыцыі Стар. 4

Вясёлай музыкай і спевамі віталі гасцей на пастаўскім міжнародным фестывалі

Прыцягальны музычны свет

Міжнародны фестываль “Звіняць цымбалы і гармонік” у чарговы раз сабраў у Паставах аматараў народнай музыкі з розных краін

Кацярына Аляксандрава

Старажытныя Паставы сёлета прымалі лепшых выканаўцаў музычнага інструментальнага фальклору з Беларусі, Расіі, Эстоніі, Літвы і Латвіі. Усяго на працягу трох фестывальных дзён у Паставах звыш за 600 самадзейных выканаўцаў здзіўлялі гледачоў каларытнымі здабыткамі народнай творчасці.

Сапраўды, пастаўскі фестываль “Звіняць цымбалы і гармонік” стаў адметнай з’явай у культурным жыцці краіны. У яго склалася і свая гісторыя, з’явіліся і шматлікія прыхільнікі. Гэты яскравы форум народных выканаўцаў нарадзіўся ў Віцебску аж дваццаць тры гады таму, двойчы праходзіў у Магілёве. Аднак потым назаўжды прапісаўся менавіта ў Паставах.

І разгадка гэтаму простая: справа ў тым, што жыхарам Паазер’я ўдалося зберагчы народныя музычныя традыцыі, захаваць адметнасць рэпертуару і самабытнасць ігры на музычных інструментах. А ўсё таму, што захапленне нацыянальнымі музычнымі інструментамі дагэтуль перадаецца тут з пакалення ў пакаленне. І сёння ніводнае свята не абыходзіцца на Пастаўшчыне без цымбалаў, гармоніка і скрыпкі.

Вядома, што музычная школа была заснавана ў гэтых мясцінах яшчэ ў XVIII стагоддзі Антоніем Тызенгаўзам. Аднак і цяпер яе здабыткі беражліва захоўваюцца, перш за ўсё дзякуючы мясцовым самабытным калектывам. Сярод іх — і Груздаўскі цымбальны аркестр, што быў створаны ў трыццатыя гады мінулага стагоддзя. Цяпер гэта заслужаны аматарскі калектыў Беларусі ансамбль “Паазер’е”, у складзе якога — выкладчыкі Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў.

Цікава, што адна з музыкаў ансамбля, Ванда Мацкевіч, іграе не на сучасным музычным інструменце, а на тым, на якім гралі продкі яшчэ сто гадоў таму. Менавіта пад старадаўнія цымбалы танчылі полькі, кадрылі, вальсы нашы прабабулі і прадзядулі. Такі інструмент — сапраўдная сямейная рэліквія, прызнаецца Ванда Іванаўна.

Аднак не толькі песнямі здзіўляе гасцей пастаўскі фестываль. Вабіць яшчэ і знакамітымі пачастункамі. “Ёсць такая прыкмета, — гаворыць кіраўнік народнага клуба нацыянальнай кухні, гульняў і абрадаў “Традыцыя” Ганна Балаш. — Хто паспрабуе пастаўскую гарбату з зёлкамі, пірагі ці іншыя ласункі і прысмакі, прыгатаваныя па старадаўніх беларускіх рэцэптах, той абавязкова вернецца сюды зноў. І не аднойчы”.

ВЕСТКІ

Багатая спадчына

X Міжнародныя Купалаўскія чытанні “Янка Купала. Дыялог з XXI стагоддзем” сабралі ў Мінску каля сарака вучоных з Беларусі, Украіны і Польшчы.

Юбілейная канферэнцыя прысвячалася 130-годдзю з дня нараджэння першага народнага паэта Беларусі. Вучоныя трох краін, навуковыя інтарэсы якіх звязаны з вывучэннем жыцця і творчасці Янкі Купалы, абмяркоўвалі актуальныя пытанні купалазнаўства, аналізавалі творчасць паэта, яго ўплыў на фарміраванне беларускай філасофскай і эстэтычнай думкі.

Такое гучнае і звонкае свята

На фестываль беларускай культуры ў Томску з’ехаліся многія творчыя калектывы суайчыннікаў

Свята беларускай культуры “Радзіма мая — Беларусь” прайшло ў Томскай вобласці Расіі. Ладзілі фэст нацыянальна-культурныя аб’яднанні беларусаў Томска. А ў госці да іх прыехалі творчыя калектывы этнічных беларусаў з Барнаула, Новасібірска, Цюмені, Омска, Самары, а таксама з Казахстана. Пад час фестывалю на сцэнічных пляцоўках горада Томска, раённых цэнтраў і сёл вобласці прайшлі шматлікія канцэртныя праграмы. Артысты здзіўлялі гледачоў таксама святам “Купалле”, якое праводзілі па старадаўніх абрадах, і майстар-класамі па традыцыйных народных рамёствах. Усяго ў фестывалі “Радзіма — мая Беларусь” удзельнічала каля тысячы чалавек.

ПАРАЛЕЛІ

“Каб было адкрыта сэрца…”

З дапамогай Інстытута культуры Беларусі будуць ствараццa культурныя цэнтры ў замежных краінах

Каля 20 тысяч чалавек, дарослых і дзяцей, наведалі Інфацэнтр японскай культуры ў Беларусі, які працуе ўжо 13 гадоў і месціцца ў сталічнай дзіцячай бібліятэцы № 5. Яго кіраўнік Масако Тацумі сан прывяла гэты факт, калі выступала з прывітальным словам перад ўдзельнікамі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці”. Сустрэча прадстаўнікоў дзевяці краін прайшла ў чэрвені ў Інстытуце культуры Беларусі.

Спадарыня Тацумі падкрэсліла, што шмат беларусаў цікавяцца японскай культурай, у сваю чаргу, наадварот, ёсць нямала японцаў, якім цікавая культура беларуская, тутэйшыя традыцыі…

“Беларусь і Японія аддалены адзін ад аднаго на тысячы кіламетраў, але гэтая вялікая адлегласць не перашкаджае цікавасці да чужой культуры, — сказала яна. — Галоўнае, каб было адкрыта сэрца, якое можа ўбіраць ў сябе чужое духоўнае багацце... І ў развіцці двухбаковай цікавасці, супрацоўніцтва, я ўпэўнена, важную ролю адыграе Інстытут культуры Беларусі…”

Масако Тацумі сан нагадала, што праз два гады будзе юбілей — 200-я ўгодкі з дня нараджэння Іосіфа Гашкевіча — першага расійскага консула ў Японіі. “Менавіта ён, беларус, адкрыў у нашай краіне на востраве Хакайда першае рускае консульства і стварыў першы руска-японскі слоўнік; ён добра ведаў японскую мову, а рускай навучаў мясцовых жыхароў.

→ Стар. 2

Масако Тацумі знаёміцца з выданнямі Інстытута культуры

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

“Голас Радзімы” — на пачэсным месцы

На гарадскім свяце ў Новасібірску прэзентаваліся беларускія выданні

Іван Іванаў

Людміла Шчаслівенка прэзентавала на свяце штотыднёвік “Голас Радзімы”

Жаданы імідж Беларусі ў свеце ствараецца, як вядома, намаганнямі многіх людзей, у тым ліку і нашых суайчыннікаў у замежжы. А нагода сказаць добрае слова пра Бацькаўшчыну заўсёды знойдзецца. Тое разумеюць актывісты Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў імя святой Ефрасінні Полацкай — і “ловяць спадарожны вецер” у свае ветразі. Прывядзем нядаўні прыклад такой адкрытасці жыццю. Калі ў Першамайскім скверы Новасібірска ладзілася свята “Дзень “Праўды”, прымеркаванае да 100-годдзя з часу першага выхаду калісьці вельмі аўтарытэтнай газеты “Правда”, то ў ім удзельнічалі і нашы суайчыннікі. У прыватнасці, па прапанове арганізатараў Культурна-асветніцкі цэнтр прадставіў аб’ектыўную інфармацыю пра друкаваныя сродкі масавай інфармацыі Беларусі.

У прыгожа афармленай палатцы можна было пабачыць, пагартаць папулярныя цяпер у краіне газеты “СБ. Беларусь сегодня”, “7 дней”, “Белорусская нива”, “Культура”. А нехта з беларусаў згадваў, як і сам раней выпісваў газету для моладзі “Знамя юности” ці дзіцячую “Зорьку”, беларускамоўную “Звязду”. Пераходзілі з рук у рукі і часопісы “Беларуская думка”, “Алеся”, “Нёман”, “Беларускі гістарычны часопіс”…

Прыемна, што і газеце “Голас Радзімы” там знайшлося пачэснае месца — тое відаць на здымку, які даслала ў рэдакцыю наша актыўная аўтарка Людміла Шчаслівенка, намеснік дырэктара Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў імя святой Ефрасінні Полацкай. Яна паведамляе, што новасібірскія беларусы, выкарыстаўшы магчымасць, зладзілі і невялічкую выставу розных побытавых прадметаў, сувеніраў, зробленых майстрамі народных промыслаў Беларусі.

З асаблівай гордасцю землякі прадставілі на сваім нацыянальным падворку і фотаінфармацыю пра візіт губернатара Новасібірскай вобласці Васіля Юрчанкі ў Беларусь, яго сустрэчу з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама пра нядаўняе падпісанне ў беларускай сталіцы Дагавора аб пабрацімскіх стасунках паміж Мінскам і Новасібірскам.

Дзень, калі святкавалі юбілей газеты “Правда”, быў цёплым, сонечным, і тысячы гараджан наведалі мерапрыемства. А беларусы радаваліся яшчэ і таму, што бачылі: газеты з Бацькаўшчыны разбіраліся з вялікай цікавасцю, у адрас жа самой Беларусі гучалі добрыя словы, пажаданні поспехаў. “Новасібірцы падтрымліваюць як губернатара вобласці, так і мэра горада ў памкненні ўмацоўваць брацкія стасункі з Беларуссю, і гэта нам вельмі прыемна”, — зазначае Людміла Шчаслівенка.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

З цеплынёй гавораць землякі

Творчы вечар пад назвай “Беларусь — радзіма мая” прайшоў ва ўтульным доме беларускай сям’і Максімавых, якая пражывае ў Грузіі. Завіталі на яго сябры з беларускай суполкі, а таксама — прадстаўнікі Савета лідараў нацыянальных меншасцяў.

Цікавымі ўспамінамі аб сваім першым прыездзе ў Грузію падзялілася адна з арганізатараў вечара, намеснік старшыні Саюза беларусаў Грузіі Лідзія Лярскі-Шацірышвілі. Жанчына прызналася, што была вельмі здзіўлена тым, як ў гэтай краіне мала ведаюць пра Беларусь. Лідзія Лярскі-Шацірышвілі вырашыла выправіць становішча, і на вечары шмат расказвала пра “цуды роднага краю”. З захапленнем апавядала пра Белавежскую пушчу — запаведнік, якому каля шасцісот гадоў, пра Брэсцкую крэпасць, Мірскі замак, Сафійскі сабор у Полацку, Будслаўскі касцёл бернардзінцаў, возера Нарач — самае вялікае ў краіне, вада ў якім з часам становіцца ўсё чысцей і чысцей, што здзіўляе нават навукоўцаў.

Гаспадыня дома, сябра Саюза беларусаў Грузіі Алена Максімава, пазнаёміла гасцей з гісторыяй і культурай Беларусі, геральдыкай і нацыянальнай сімволікай. Правяла невялікі экскурс у эканоміку, расказвала пра адметнасці адукацыі і аховы здароўя. “Беларусь называюць сінявокай, бо на яе тэрыторыі багата азёраў, — гаварыла А. Максімава, — А народнымі сімваламі лічацца валошка і бусел”.

Ліліян Благоева прачытала вершы Анатоля Вярцінскага і распавяла аб дружбе, якая звязвала яе сям’ю з сям’ёй паэта. Напрыканцы вечара гасцей чакаў стол са знакамітымі беларускімі дранікамі.

Кацярына Радкевіч, Хатуна Мамніашвілі, Грузія

НАШЧАДКІ ПЕСНЯРОЎ

Знакамітыя творцы заўсёды ў пашане

Беларусы Латвіі адзначаюць юбілей Янкі Купалы і Якуба Коласа

III Міжнародны фестываль беларускай паэзіі і песні ў Латвіі прысвячаўся сёлета 130-м угодкам беларускіх пісьменнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. У розных гарадах і мястэчках краіны — Рызе, Ліепаі, Даўгаўпілсе, Екабпілсе, Рэзекне, Зілупе, Прейлях, Лудзе, Вілянах, Краславе, Дагдзе — прайшлі святочныя канцэрты. Гучалі беларускія песні на вершы славутых песняроў. Выступалі на фестывалі творчыя калектывы суайчыннікаў — ансамблі “Надзея” з Рыгі, “Паўлінка” з Ліепаі, “Купалінка” і “Ластаўкі” з Даўгаўпілса, “Куток” з Краславы, “Завіруха” з Екабпілса, “Рабінушка” з Прэйляў, “Вярба” з Дагды.

З Мінска ж у госці да латышскіх сяброў прыехаў народны гурт “Вербіца”, якім кіруе таленавіты малады музыка Аляксандр Свірскі. А ў канцэрце ў Даўгаўпілсе ўдзельнічаў народны ансамбль “Цярэшка” з беларускага горада Глыбокае. Паэт Станіслаў Валодзька чытаў вершы, прысвечаныя класікам.

Такія незвычайныя гастролі па краіне доўжыліся больш за тыдзень, і ўсюды артыстаў суправаджала мабільная выстава, якая раскрывала жыццёвы і творчы шлях паэтаў. Яшчэ — у тых гарадах, дзе праходзіў фестываль, да імпрэзы з задавальненнем далучаліся і мясцовыя творчыя калектывы розных нацыянальнасцяў. Адным словам, свята беларускай паэзіі і песні ў Латвіі набыло міжнароднае гучанне.

Яніна Васілеўская, г. Даўгаўпілс, Латвія

ПАРАЛЕЛІ

“Каб было адкрыта сэрца…”

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Пад эгідай ЮНЕСКА будзе выконвацца праект, прысвечаны юбілею Гашкевіча, і ад імя нашага Інфацэнтра я планую ў ім паўдзельчаць, бо жадаю дапамагчы, каб у нашай краіне яшчэ больш зналі: быў такі беларус, які жыў і працаваў на японскай зямлі… Тыя далёкія падзеі адбываліся ў XIX стагоддзі; гэта была першая гісторыя, якая тычыцца дзвюх нашых краін. Але ёсць і пазнейшыя дачыненні, якія злучаюць беларускі і японскі народы. У прыватнасці, трагічныя: Чарнобыль і Фукусіма…”

Японская госця выклікала моцныя апладысменты аўдыторыі, калі на роднай мове — ва ўласным перакладзе — прачытала купалаўскі верш “А хто там ідзе?” Гэта быў сюрпрыз, які яна падрыхтавала да юбілею песняра. Спадарыня Тацумі пажадала калектыву інстытута росквіту і доўгага сяброўскага супрацоўніцтва.

А пачатак такога сяброўства Інфацэнтра японскай культуры і Інбелкульта ўжо пакладзены. Дастаткова сказаць, што з удзелам Масако Тацумі сан яшчэ ў красавіку за круглым сталом абмяркоўваліся тэмы двухбаковых сувязяў у выдавецкай дзейнасці, магчымых сумесных культурна-адукацыйных праектаў, а таксама перспектыў разнастайнага практычнага супрацоўніцтва беларускіх і японскіх спецыялістаў у сферы культуры.

Настрой удзельнікам канферэнцыі ўздымала песня

Тэма функцыянавання культурных цэнтраў замежных краін, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, гучыць у Інбелкульце ўсё часцей. Напрыклад, не так даўно тут вывучалі працу Расійскага цэнтра навукі і культуры — ў рамках Рэспубліканскай рады дырэктараў.

Але патрэбна больш ўпэўнена рухацца насустрач. Аб гэтым казалі і ўдзельнікі канферэнцыі. “Адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Міністэрства культуры — прадстаўленне дасягненняў нацыянальнай культуры за межамі краіны, стварэнне яе ўласнага іміджу праз замацаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, — падкрэсліў ва ўступным слове на канферэнцыі міністр культуры Беларусі Павел Латушка. — Перад намі стаіць важная задача: з аднаго боку, паляпшэнне ўспрымання і запатрабаванасці беларускай культуры грамадзянамі нашай краіны, з другога — стварэнне ўмоў для шырокай прэзентацыі каштоўнасцяў беларускай культуры ў яе разнастайнасці за мяжой. Важным таксама з’яўляецца падтрымка культурнай дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў беларусаў замежжа…”

Нагадаем, ў Інбелкульт перададзены архіў былога Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францыска Скарыны — асноўныя дакументы і матэрыялы аб беларускай дыяспары. Зроблена гэта ў мэтах развіцця работы па збору і сістэматызацыі матэрыялаў аб сацыяльна-культурнай дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў беларусаў замежжа, правядзенню навукова-практычных даследванняў.

Кастусь СТАЛЯРЧУК, супрацоўнік Інстытута культуры Беларусі

ЭКСПАЗІЦЫЯ

...І роспіс золатам па шкле

У Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрылася выстава твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Каштоўныя ўзоры” з Гістарычнага музея Расіі

Людміла Малей

На адкрыцці выставы прысутнічалі супрацоўнікі абодвух музеяў, а таксама прадстаўнікі міжнароднай кампаніі Japan Tobacco International, пры падтрымцы якой стала магчымай такая падзея. Дырэктар кампаніі Генадзь Бруснікаў адзначыў, што гэтая выстава — яшчэ адзін крок, які прадстаўляе і папулярызуе агульную гісторыка-культурную спадчыну, дае новы імпульс супрацоўніцтву не толькі музеям, але і грамадскасці абедзвюх краін.

І гэта не першы праект гістарычных музеяў Беларусі і Расіі. Некалькі гадоў назад названыя ўстановы праводзілі сумесную выставу слуцкіх паясоў. Цяпер жа, як паведаміла Марыя Чысцякова, намеснік дырэктара Гістарычнага музея па навукова-фондавай рабоце, усе экспанаты — выключна з маскоўскіх фондаў, якія налічваюць каля пяці мільёнаў унікальных гістарычных каштоўнасцяў. Каб адлюстраваць усё багацце калекцыі, для выставы былі падабраныя экспанаты XIX — XX стст. з фондаў усіх пяці аддзелаў Гістарычнага музея Расіі: каштоўных металаў, рукапісаў і старадрукаваных кніг, шкла і керамікі, тканін і касцюма, металу, створаныя не толькі ў Расіі, але і на ўсёй тэрыторыі Еўропы і Азіі.

Таццяна Сізова, загадчыца аддзела каштоўных металаў, і Эмілія Шульгіна, загадчыца аддзела рукапісаў і старадрукаваных кніг Гістарычнага музея Расіі, правялі экскурсію. Яны прэзентавалі 137 выдатных помнікаў гісторыі з бронзы, срэбра, шкла, керамікі, скуры і тэкстылю, якія ў Мінску знаходзяцца ў спецыяльных вітрынах пад трыма ступенямі абароны, а экспазіцыйныя плошчы, дзе выставілі гістарычныя каштоўнасці, — пад дадатковай сігналізацыяй. Ва ўпрыгожванні іх майстры выкарыстоўвалі золата, што з антычных часоў успрымалася людзьмі, як застылыя сонечныя прамяні. Золата ў выглядзе пазалоты, інкрустацыі, дэкарыравання ўсіх відаў залачэння, вядомых у XVI-XX стст. ужывалася таксама з такімі экзатычнымі матэрыяламі, як панцыр чарапахі або акулавая скура (галюша), выкарыстоўвалася і ў арнаментальных застаўках рукапісаў, рукатворнай або друкаванай мініяцюры, у афармленні каштоўных вокладак кніг. Адзін з самых дзівосных спосабаў прымянення золата — гэта пісьмёны. Рукапісы, упрыгожаныя залатым узорам, — гэта тонкая і шматдзённая праца. Над кожным лістом паперы і пісец, і мастак шмат працавалі, перш чым сшыць іх у кнігу і заключыць у дашчатую вокладку з нацягнутай на яе скурай.

Кожны з экспанатаў выставы — рарытэт. Найбольш старажытным з’яўляецца пергаментны ліст з італьянскай харавой кнігі XIV стагоддзя, а самыя новыя творы — пазалочаныя браціны і коўш, выраблены маскоўскім ювелірам Яўгенам Сарыкіным у 1980-х гадах.

Сярод каштоўных рэчаў — роспісы золатам па шкле, створаныя ў Санкт-Пецярбургу на Імператарскім шкляным заводзе ў канцы XVIII — пачатку XX стагоддзя. Гэтыя шэдэўры, выраблены з далікатнага матэрыялу, на шчасце, захаваліся да нашага часу. Шкло было раней вельмі дарагім. І спачатку завод абслугоўваў выключна імператарскі двор, але з часам мода на вазы, разнастайныя чаркі, графіны і шклянкі стала распаўсюджвацца і сярод вышэйшых слаёў Пецярбурга. А вось яйка з каштоўным узорам і зашпількай, упрыгожанай дыяментам, стала правобразам знакамітых вырабаў Фабержэ.

Кожны з прадметаў некалі належаў нейкаму чалавеку, быў часткай яго жыцця: магчыма, вышываную залатой ніткай хустку насіла па святах прыгожая вясковая дзяўчына, золатам шыты бант ў касу прышпільвала дачка заможнага купца, адным з сярэбраных каўшоў карыстаўся князь Галіцын, фаварыт царэўны Соф’і, а гаспадыняй футарала з акулярамі была імператрыца Кацярына II. Аднак сёння ўсё роўна — знакамітае ці невядомае было імя ў уладальніка той ці іншай рэчы. Кожная з іх — сведка часу і асаблівага майстэрства продкаў.

На выставе “Каштоўныя ўзоры”

ГЛЫБІНКА

Вяртанне да гасцінных вытокаў

У мітусні гарадскога жыцця, штодзённых клопатах так хочацца знайсці свой востраў спакою. І душа просіцца туды, дзе можна адчуць пяшчотны цёплы ветрык і пачуць шум лісця, спевы птушак. З’ехаўшы з Барысаўскага гасцінца, што вядзе ў бок Бягомля, у лес, хутка трапляем у невялічкую вёску.

Глухую, лічы, закінутую. Шукаем дом № 7 па прыгожай па назве вуліцы Крынічнай. Не так гэта і цяжка. Бо ў вёсцы з адной вуліцай сярод старых вясковых хат гэтая вызначаецца, у нейкай ступені, сучасным дызайнам. З аднаго боку вядзецца будаўніцтва цаглянай агароджы, насупраць — ужо пабудаваны басейн для дзяцей. Праз шкляныя цэнтральныя дзверы праглядваецца фае.

Дзверы адчыніў гаспадар аграсядзібы “Наша хата біясфера” Мікалай Люцько. Правёўшы экскурсію па сядзібе, расказваў:

— Думка заняцца сельскім адпачынкам прыйшла выпадкова. Родам я з Падсвілля, што на Глыбоччыне, але з’ехаў адтуль даўно. Спачатку вучыўся ў суворaўскім вучылішчы, затым — у вышэйшым ваенным, а пасля скончыў Белдзяржуніверсітэт, юрыдычны факультэт. Шмат вандровак зрабіў па свеце. Жыў у Маскве, працаваў паслом у Чэхаславакіі. Маю кватэру ў Мінску. І вось аднойчы вельмі захацелася цішыні.

На ўлонні прыроды — добры адпачынак

Часта з сябрамі Мікалай Люцько абмяркоўваў, як лепш за ўсё адпачыць. Заўсёды сыходзіліся на думцы: на прыродзе, у вясковай хаце. Каб без мітусні, шуму машын, паху гарачага асфальту. Сярод гонкіх соснаў.

І вось нарэшце Мікалай Люцько набыў сядзібу і ўзяўся за справу. “Вельмі ўдзячны тагачаснаму старшыні Бягомльскага пасельвыканкама Людміле Дашыневіч, якая дапамагла ўладкавацца гараджаніну з сельскімі каранямі, — гаворыць Мікалай Мікалаевіч. — Я тады на радасцях адразу ж каня купіў. Гэты конь быў то рабочым, то выязным. Прыезджыя на адпачынак любілі пакатацца на санях, сесці ў сядло. Праўда, трымаць каня не так і проста… Ды і ўсё, што звязана з узвядзеннем аграсядзібы, арганізацыяй адпачынку выклікае пэўныя цяжкасці. Праўда, я прывык да таго, што само нічога не ідзе, не плыве. Без працы рук сваіх, без свайго мыслення дабіцца чагосьці станоўчага, добрага не атрымаецца”.

Сёння турысты едуць да яго ў госці. Па словах Мікалая Мікалаевіча, жыццё ў такім доміку дорага не каштуе. Які-ніякі прыбытак гаспадар мае за кошт колькасці адпачываючых. А каб атрымліваць вялікі і стабільны прыбытак, прызнаецца Люцько, трэба пабудаваць сетку сядзіб. На гэты ж час у яго ёсць яшчэ адзін домік на Браслаўскіх азёрах.

Безумоўна, Кліннікі адрозніваюцца ад Браслава. Аднак тут б’е жыватворная крыніца, тут амаль да хаты прыходзяць чарадой ласі і алені, тут такія хараство і раскоша! “Неяк адпачываў у “Нашай хаце біясферы” немец, дык ён ніякай дапамогі не прасіў: сам шчапаў дровы і паліў іх у коміне, сам з вядром хадзіў за крынічнай вадой”, — узгадвае гаспадар.

Відавочна, што менавіта гармонія прыроды найбольш спрыяе здароўю чалавека. Адпачынак дае сілы і дзеля разважанняў, і для фізічнай працы.

Мікіта Бяляўскі,
студэнт Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта

Старажытныя глечыкі на сучасны лад

Юныя ганчары ў Століне адраджаюць даўнія традыцыі

Іван Лодкін

Століншчына — адзін з найпрыгажэйшых рэгіёнаў беларускага Палесся з унікальнымі помнікамі археалогіі, з ланцугом балот, маленькіх рачушак і азёр. Не выпадкова, што і легенда "Адкуль ёсць і пайшоў беларус…" нарадзілася на Палессі. Памятаюць аб сваім адмысловым месцы ў гісторыі і тутэйшыя жыхары — уважліва ставяцца да традыцый.

Здаўна славіцца вёска Гарадная на Століншчыне народнымі промысламі. Асабліва ганчарствам. Існуе нават і Цэнтр гэтага старадаўняга рамяства. Важна, што пастаяннымі яго наведвальнікамі з'яўляюцца дзеці. Сёння там працуюць тры гурткі, у якіх займаюцца 24 вучні. Вырабляюць яны і цацкі-свістулькі, і сапраўдныя глечыкі. А вучаць ганчарнаму майстэрству мясцовыя жыхары Аўраам Басавец, Васіль Казачок і Рыгор Кавалька. Усе — з каранямі старадаўніх гараднянскіх ганчароў.

Асабліва дынамічна Цэнтр стаў развівацца ў апошнія тры гады. У 2009 годзе ён удзельнічаў у фестывалі палескай культуры, што праходзіў у польскім горадзе Бельск-Падляшскі, і ў выставе на Ягелонскім кірмашы ў горадзе Любліне, а таксама ў мерапрыемствах, прысвечаных святкаванню 600- годдзя Белавежскай пушчы і рэспубліканскага фестывалю "Дажынкі" ў Кобрыне.

У 2010 годзе на базе цэнтра ў вёсцы Гарадная прайшоў Другі Міжнародны пленэр ганчароў з удзелам майстроў з васьмі краін. Пад час пленэра ўпершыню быў праведзены і "Гараднянскі кірмаш". Майстры і вучні таксама ўдзельнічалі ў першым фестывалі этнакультурных традыцый "Кліч Палесся", што ладзіўся ў вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельшчыны. Там атрымалі дыплом "За лепшы майстар-клас па адраджэнню рэдкага традыцыйнага рамяства". Важнай падзеяй для цэнтра стала паездка ганчароў у горад Скопін Разанскай вобласці на Чацвёрты міжнародны фестываль ганчароў, дзе гурткоўцы атрымалі дыплом "Промыслу, які захаваў традыцыі".

А летась галоўнай падзеяй у цэнтры стаў пленэр разьбяроў і мастакоў. У выніку тэрыторыю цэнтра ўпрыгожылі шэсць драўляных скульптур, а інтэр'ер аднаго з пакояў дапоўнілі шэсць партрэтаў патомных ганчароў, выкананых з натуры ў тэхніцы алейнага жывапісу.

Значнымі падзеямі ў жыцці Цэнтра ганчарства сталі ўдзел гурткоўцаў у свяце беларускага пісьменства і друку ў Ганцавічах, а таксама ў кірмашы "Мотыльскія прысмакі" ў вёсцы Мотыль Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

У 2008 годзе ў вёсцы Гарадная супрацоўнікамі Столінскага краязнаўчага музея быў створаны музей-сядзіба, абсталяваны як тыповая хата ганчара канца дзевятнаццатага стагоддзя.

"Раней ганчарства для мясцовых жыхароў было сродкам існавання, — гаворыць дырэктар Цэнтра Алімпіяда Леанавец. — Землі ў наваколлі бедныя, таму мужчынам, каб пракарміць сем'і даводзілася займацца гэтым рамяством. Вырабы з гліны на так званых фурах (альбо калёсах) гарадноўцы развозілі далёка за межы Палесся. Глечыкі, талеркі з гліны можна было набыць і ў тагачаснай Варшаве, і ў Вільні."

Гаршкалятамі называюць юных ганчароў на Палессі

Сёння ў Цэнтры па-ранейшаму няма сучасных прыстасаванняў, якія б дазволілі нейкім чынам палегчыць вытворчасць. Тут спрабуюць ва ўсім вытрымліваць тэхналогію XVII стагоддзя, калі ў Гарадной пачыналася ганчарная справа. Гэта прынцыповая пазіцыя гурткоўцаў. "Інакш, — кажуць яны, — якасць вырабаў будзе не тая".

Нават тыя хлопчыкі і дзяўчынкі, якія прыязджаюць у Гарадную на лета да бабуль, з вялікім задавальненнем ідуць у Цэнтр. "У мясцовай школе нават з'явілася такое паняцце як гаршкаляты, — тлумачыць вялікі інтарэс да ганчарства падлеткаў спадарыня Алімпіяда. — Да іх далучаюць тых, хто толькі пачынае займацца старажытным рамяством".

Зараз у Цэнтра напружаны перыяд. Ідзе падрыхтоўка да Трэцяга міжнароднага пленэра.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Пра Багдановіча — па-кітайску

Мікола Берлеж

Славу літаратуры прыносіць веданне яе прадстаўнікоў у свеце. Мы прызвычаіліся, што ў Еўропе, Азіі, Амерыцы пра беларускую літаратуру мяркуюць па перакладах аповесцяў Васіля Быкава, дакументальных расповедах Святланы Алексіевіч, вершах Янкі Купалы, Якуба Коласа... А ці вядомы іншыя пісьменнікі, нават класікі чытачам на далёкіх ад Беларусі прасторах?

Велічны талент аўтара паэтычнага зборніка "Вянок", як сведчаць бібліёграфы, вядомы не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах свету. Творы Максіма Багдановіча гучаць на англійскай, балгарскай, венгерскай, грузінскай, іспанскай, казахскай, літоўскай, малдаўскай, мангольскай, нямецкай, польскай, рускай, славацкай, татарскай, туркменскай, узбекскай, украінскай, французскай, чувашскай, чарнагорскай, харвацкай мовах. Канешне ж, засваенне спадчыны класіка беларускай паэзіі ў першую чаргу найболей адбываецца ў літаратурах Расіі, Украіны, Польшчы. А летась, у 2011 годзе, у кітайскім часопісе "Руская літаратура і мастацтва", які выдаецца ў Пекінскім дзяржаўным педагагічным універсітэце, надрукаваны артыкул Алеся Карлюкевіча і Веранікі Карлюкевіч "Жыў народнымі інтарэсамі...", прысвечаны 120-гадоваму юбілею Максіма Багдановіча. У тэксце цытуюцца вершы "З песняў беларускага мужыка", "Як Базыль у паходзе канаў". Часопіс "Руская літаратура і мастацтва", галоўным рэдактарам якога з'яўляецца доктар філалагічных навук Ся Чжунсянь, у розныя гады звяртаўся да разгляду творчасці Васіля Быкава. Двойчы на старонках выдання друкаваліся артыкулы, прысвечаныя беларускаму мастаку Георгію Паплаўскаму. У якасці ілюстрацыі былі выкарыстаны яго графічныя работы па творах Янкі Купалы і Васіля Быкава.



Максім Багдановіч

І апошняя па часе навіна з Пекінскага педагагічнага ўніверсітэта: аспірантка Інстытута замежных літаратур спадарыня Чжан Юань тэмай сваёй дысертацыі абрала паэзію Максіма Багдановіча. Дзеля гэтага маладая даследчыца збіраецца прыехаць у Беларусь, дзе, канешне ж, паспрабуе пазнаёміцца з творамі паэта на мове арыгінала. А пакуль Чжан Юань чытае Багдановіча на рускай мове.

ДУХОЎНАСЦЬ

Сузор'е на іўеўскай зямлі

Кацярына Аляксандрава

Манумент "У гонар дружбы і адзінства канфесій Іўеўшчыны" з'явіўся нядаўна на цэнтральнай плошчы раённага цэнтра. Ён уяўляе сабой чатыры велічныя стэлы з аркамі. Кожная з іх прысвечана адной з чатырох канфесій, прадстаўнікі якіх здаўна жывуць на Іўеўшчыне: каталікам, праваслаўным, мусульманам і іўдзеям. У час адкрыцця манумента вернікі асвяцілі кожную са сваіх стэл.

Да мерапрыемства было прымеркавана і правядзенне ў Іўі навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі "Іўеўская зямля — сузор'е народаў, рэлігій і культур", у якой удзельнічалі вучоныя, краязнаўцы, прадстаўнікі духавенства.

У Іўі здаўна жывуць побач прадстаўнікі розных канфесій

Невыпадкова Іўе ў Гродзенскай вобласці называюць горадам чатырох рэлігій. Бо на працягу многіх стагоддзяў тут суседнічалі праваслаўныя, іўдзеі, каталікі і мусульмане. І ніводнага разу не было тут канфліктаў на рэлігійнай глебе. Не выпадкова, што і сёння ў райцэнтры знаходзяцца культавыя будынкі кожнай з канфесій.

Дарэчы, Іўе неафіцыйна лічыцца сталіцай беларускіх татараў. У савецкі час тут існавала адзіная ў Беларусі дзеючая мячэць, дазвол на будаўніцтва якой яшчэ ў 1882 годзе дала ўладальніца Іўя графіня Замойская. Такім чынам яна адзначыла заслугі татараў, якія жылі на Іўеўшчыне, — выдатных гарбароў і земляробаў. За 120 гадоў мячэць не закранулі ні войны, ні пажары. Сёння татарская абшчына ў Іўі налічвае амаль тысячу чалавек і з'яўляецца адной з самых буйных у краіне.

Сінагога ў Іўі цудам уцалела пасля пажару ў пачатку XX стагоддзя і была рэстаўрыравана пасля Другой сусветнай вайны.

Самай вялікай жа ў горадзе з'яўляецца каталіцкая парафія. Касцёл Пятра і Паўла стаіць на высокім узгорку. Ля яго з любой кропкі горада можна ўбачыць фігуру Хрыста.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E-mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1945, Заказ: 740
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2012